23.10 «Секретные материалы». Телесериал.
0.05 «Альфред Хичкок представляет». Телесериал.
0.40 Ночной музыкальный канал.
1.40 Музыка на СТВ.

ТВ ЦЕНТР

6.25 Смотрите на канале.
6.30 «Москва на все времена». Документальный сериал.
7.00 «Отчего, почему?» Программа для детей.
8.00 Мультпарад. «Тайна страны Земляники», «Как казаки на свадьбе гуляли».
8.45 Музыкальная программа «Полевая почта».
9.15 Наш сад.
9.35 Лакомый кусочек.
10.00 Московская неделя.
10.25 Деловая лихорадка.
10.45 Русский детектив. «Свидетельство о бедности».
12.00 «Высокая горка». Мультфильм.
12.25 Игорь Ливанов в программе «Приглашает Борис Ноткин».
13.00, 22.00 События. Время московское.
13.15 Все о здоровье в программе «21-й кабинет».
13.45 «Алфавит». Телеигра.
14.25 Ток-шоу «Слушается дело».
15.15 «Чисто английское убийство». Телесериал (Великобритания). Фильм 19-й. «Биржа для убийств».
17.10 «Магия». Театральная программа.
17.55 Многосерийный Худ. фильм «Дело Фершо» (Франция). 2-я серия.
19.00 «Момент истины». Авторская программа А.Караулова.
19.55 Прогноз погоды.
20.05 «Преферанс по пятницам». Худ. фильм.
22.10 Спортивный экспресс.
22.45 Сенсации и не только в программе «Деликатесы».
23.15 Золотая фишка.
0.10 На ночь глядя. «Даки». Худ. фильм (Румыния).

• Алло, мы вас слышим

Аттестат или кошелек?

Уважаемая редакция, прошу опубликовать моё письмо, потому как у многих из нас есть дети, и я рассчитываю на поддержку других матерей и общественности. Для всех уже давно материнская любовь не иначе как "слепая", "лишённая объективности". Конечно, я не исключение. И всё-таки постараюсь придерживаться только фактов.

Мой ребёнок учится в школе №65 с углубленным изучением английского языка. Каждый год он заканчивал с грамотой, по его поведению острых вопросов не возникало. Когда перешёл в старшие классы, поначалу с учёбой тоже всё шло хорошо. Постепенно сын съехал на "четвёрки", и однажды к нам домой под предлогом ознакомления с детским уголком зашёл его классный руководитель, учитель математики М. Л-ко. С этого началось что-то ужасное. Видно, мой внешний вид уже давно обсуждался некоторыми наставниками, а после вида нашей квартиры, где мы сделали полуевроремонт, "кушать" захотелось всерьёз. Хотя я состояла в родительском комитете и никогда ни на что не жалела денег. Например, на вечеринке в клубе "Реактор" я за свой счёт накрыла стол для педагогов...

На этом же "празднике" зав. по воспитательной части Т. Л-ва предложила мне обустроить в школе комнату социально-психологической разгрузки. Я не хотела с ними портить отношения и согласилась — как оказалось, я сделала страшную ошибку. После того, как я купила краску, заплатила маляру, и он приступил к работе, я заикнулась о том, что, возможно, кто-нибудь ещё поддержит этот "проект", так как мне одной его не потянуть. После этого было предложено подыскать для моего сына другую школу. Я этого не сделала, и тогда на меня и на ребёнка посыпались обвинения. Классный руководитель мог позвонить домой, сообщить, что "этот хулиган" ушёл с двух последних уроков в сторону "Макдональдс". Когда я приезжала в школу, оказывалось, что сын на месте. А информацию г-н Л-ко получил от детей и почему-то забыл её проверить. "Информаторов", конечно, тоже никто не наказывал. Был случай, когда учительница английского языка обвинила сына в каких-то разломанных кранах — в то время, когда у него был гипс на правой руке...

У меня создалось впечатление, что просто, что бы ни случалось, когда не было виноватых, им становился мой ребёнок. Бывали и спорные случаи. Например, девочка из 5 "А" класса оказалась запертой в туалете, в чём тоже обвинили сына. Я не понимаю, где были дежурные учителя и где "виновный" откопал ключ от туалета? Почему-то в этой школе сразу на всех этажах туалеты не работают, их открывают по очереди. Наверное, чтобы меньше убирать. Может, сама уборщица по ошибке и заперла пострадавшую девочку?

В общем, утверждать, что мой ребёнок не причастен, я не могу. Но, как мне кажется, до конца в этом никто не разбирался. Просто меня убеждали, что мой сын ненормальный. Это был постоянный прессинг. Я просила школьного психолога (модная сейчас должность) поговорить с моим сыном, дать ему какой-нибудь тест, но психолог сына даже ни разу не вызвал. У меня начался невроз. Я в самом деле начала сомневаться в психике ребёнка! Я начала таскать его по психоневрологам, психиатрам, которые смотрели на меня непонимающими глазами и советовали уехать отдохнуть. У них я набрала справок, которые свидетельствуют о необоснованности обвинений некоторых преподавателей в сторону сына.

Пошла искать правду. При разговоре с директором школы выяснилось, что он ничего ни о чем не знал. В РОНО с моей ситуацией обещала разобраться г-жа Т.П. Хоружая. Но ответа по моему вопросу мне никто до сих пор не дал. В общем, некоторые учителя мне посоветовали обратиться в министерство, куда, конечно, я отправлюсь. Просто, возможно, есть матери, которые также сталкивались с подобным вымогательством и не побоятся откликнуться.

Я взрослый человек, всё понимаю, сама работаю учителем в музыкальной школе. Всем нужны деньги, но разве можно делать их так? У моего сына сейчас переходный возраст, об опасностях которого так модно говорить. Что может стать с ним после такого "общения" с педагогами? Разве можно забывать, для чего мы приходим работать в школы? Я не могу сказать, что все преподаватели в этой школе так себя ведут. Я благодарна многим учителям за хорошее отношение к моему сыну, за отзывы о нём как о "парне с головой". Просто боюсь называть фамилии, навредить им. Я также не хочу называть свою фамилию из опасений продолжения этой истории уже в другой школе.

С уважением Ольга М.

От редакции: ***В письме были указаны полные фамилии преподавателей, но мы их не публикуем. Профэтика обязует нас дождаться ответа из РОНО, где все (пофамильно) известно. Кстати, не потеряли ли там директиву о сроках работы с письмами и заявлениями граждан? И, может быть, в обсуждение-разрешение конфликтной проблемы вмешаются не только матери, как надеется Ольга, но и ответственные работники из обязанных контролировать СШ № 65 органов? Всем дадим в газете место!***

Любі музыку — ненавідзь фашызм!

Больш за 400 чалавек сабралося на вялізным фэсьце "Любі музыку — ненавідзь фашызм!", які адбыўся 8 траўня ў гарадзенскім клюбе "Клетка". Старым заўзятарам гарадзенскай музыкі сэйшн падаўся вяртаньнем у мінулае: чымсьці ўсё нагадвала сярэдзіну 90-х гадоў, калі ў Гародні магчыма было граць канцэрты без аніякае цэнзуры.

На акцыю, якая амаль ня мела аніякае рэклямы па горадзе, сабралося столькі людзей, колькі не прыходзіла, бадай, год пяць-шэсьць. Фэст вылучыўся тым, што апрача гарадзенскіх камандаў "May be" і "Deviation" у ім прынялі ўдзел "Вон са скуры" (з Менску), "Morning after" (чарговая рэінкарнацыя вядомага менскага гурту "Hate to state"), а таксама польскі гурт з Берліна "Trompka pompka" і рагачоўская каманда "Меркаваньне даўна".

Гурты вельмі розьніліся між сабою па стылях і накірунках. "May be" запомніўся сваімі музычнымі пройгрышамі, а вось "Меркаваньне даўна" выглядала нібыта старая і дрэнная копія "Грамадзянскай абароны", якую ўжо ня бачылі гарадзенцы на працягу апошніх дзясятка год.

"Trompka pompka", што завіталі ў беларускі горад па запрашэньню сяброў і прыцягнулі за сабою вялізны аб'ём апарату, вылучаліся файным выкананьнем і дзіўным зьнешнім выглядам. Пірсынгаванае стварэньне, нібыта нейкі потвар, выйшла на сцэну... І загучалі словы па-польску, па-нямецку і па-ангельску, якія заклікалі змагацца з фашызмам. Выступ гэтага гурта зацягнуўся больш за сорак хвілінаў, і мяне пацягнула папіць піва, але ў бары была толькі "Балтыка" і нейкае іншае расейскае...



А гэта потвар з "Trompka pompka"



Стас Пачобут па звычцы «душыць» мікрафон

Але хутка стала не да піва -- на сцэну выйшла "легенда", якая не выступала нармалёвым чынам у Гародні (і ня толькі ў Гародні — **Sanitar**) на працягу апошніх чатырох год — гурт "Deviation" . Стас, які 7 траўня быў прызнаны "Міжнародной амністыяй" вязьнем сумленьня за акцыю ў падтрымку "Пагоні", і на гэтым канцэрце заклікаў прысутных прыйсьці на суд над газэтай. Прагучалі на канцэрце шэсьць песень гурта — як старыя, у тым ліку "Спасибо тов. Лукашенко!", так і з апошняй, дагэтуль не прэзэнтаванай у Менску з палітычных прычынаў праграмы "Guerilla Urbana".

Але Гародня без інцыдэнтаў не была б Гародняй — пасьля зарганізаванага незарэгістраванай КДС "Разам" канцэрту адбыўся напад на аднаго з сябраў арганізацыі. Да панка па мянушцы Дусер, які вяртаўся з акцыі, пад'ехала машына, зь якой выйшлі людзі ў цывільным. Далейшы дыялёг быў клясічным: "Дусер?" "Дусер." "Антыфашыст?" "Так." "На!" Трое ў цывільным жорстка зьбілі хлопца, які дапамагае большасьці гарадзенскіх гуртоў з памяшканьнем пад рэпэтыцыі. Але на момант здачы нумару Дусер ужо ачуняў...

Андрэй Мялешка (michelson.by.ru), для "БМ"
(захаваны правапіс арыгіналу)

N.R.M.: "Victory Day" напярэдадні Дня Перамогі

У нашай краіне, народ якой падзелены паводле палітычных прыхільнасцяў, святы страчваюць свой агульнанацыянальны сэнс. Адным не даспадобы спадчына камуністычных часоў, другія, марачы пра аднаўленне мрояў сваёй маладосці, не прызнаюць таго, што "навыдумвалі" апошнім часам. Вось так і жывем — у адной краіне, але як быццам на розных яе межах.

Вось, напрыклад, свята 9 мая — Дзень Перамогі. Для афіцыйных уладаў і іх сродкаў масавай інфармацыі гэтае свята — нагода яшчэ раз настойліва давесці да выбаршчыкаў сталага ўзросту аб сваім клопаце пра ветэранаў, каб потым на год забыць пра іх існаванне. А для моладзі, якая бачыць крывадушнасць такіх адносін, такое становішча — прамая дыскрэдытацыя і ўлады, і мінулага.

З мэтай паступова пераадольваць гэтыя супярэчнасці ды яшчэ раз нагадаць моладзі пра ваенныя мінулае нашай краіны ў BMAgroup вырашылі правесці святочны канцэрт вядомых беларускіх рок-калектываў і назваць гэтую імпрэзу "Victory Day in КЗ "Мінск". Пад гэтыя мэты кіраўніцтва КЗ "Мінск" нават прапанавала значныя зніжкі на плату за арэнду буйнейшай канцэртнай залы сталіцы.

Распачалі ж канцэртны сэт беларускія прыхільнікі спартыўнага таленту хакеіста НХЛ Адама Дэдмарша — менскі гурт "Deadmarsh", які ўпершыню трапіў на такую салідную сцэну. Але, нягледзячы на свой статус дэбютанта, музыкі прадэманстравалі немалы творчы і выканаўчы патэнцыял, прапанаваўшы слухачам цяжкую, але вельмі тэхнічна дасканалую музыку. Апошнім часам гурт шмат эксперыментуе з выкарыстаннем беларускай мовы ў самых сучасных рок-плынях. Не так даўно на дыску "Hard life-Heavy music" музыкі дэбютавалі з беларускім варыянтам трэш-метал, а на новым рэлізе BMAgroup "Hardcoreманія: чаду!" гурт упершыню прадставіў вельмі дынамічную апрацоўку супер-хіта знакамітай "Metallica" — "Enter sandman", якая ў тутэйшым варыянце па-беларуску называецца "Люстэрка ночы". Акрамя гэтага кавера ў канцэрце прагучалі новыя творы з будучага беларускамоўнага альбома "Deadmarsh", у прыватнасці песня "Няміга", ды іншы беларускамоўны кавер з рэпертуару класікаў трэш-метал — гурта "Sepultura".

Эстафету экстрэмальных плыняў падхапілі госці з Беластоку — беларускамоўны гурт "Zero-85". Для тых, хто не ведае: менавіта гэтымі лічбамі пазначаны тэлефонны код Беластоку. Нагадаем, што беластоцкія выканаўцы — лаўрэаты мінулагодняга фэсту "Басовішча" і на гэтай імпрэзе падцвердзілі высокі статус свайго лаўрэацкага звання. Лідэр гурта харызматычны, але ўраўнаважаны Юрка Асеннік пад час свайго сэту прадэманстраваў не толькі вакальныя магчымасці, але і ненавязлівы гумар, які надаў канцэрту атмасферу сяброўскай сустрэчы. Ад сябе адзначым вельмі пераканаўчае выкананне хіта "Страчана Ітака", што прадстаўлены на рэлізе "Hardcoreманія: чаду!". Гурт "Zero-85" нагадаў беларускім слухачам, што беларускамоўны рок-рух Беласточчыны жыве сваім паўнакроўным жыццём, выкрышталізоўвае сваіх супер-зорак і куміраў — цяперашніх і будучых...

А вось, што такое куміры па-тутэйшаму ўсе гледачы ў канцэртнай зале "Мінск", госці з Беласточчыны, прыхільнікі "Першага музычнага канала" (інфармацыйнага спонсара канцэрта), музычныя журналісты ды крытыкі даведаліся з выступу культавага N.R.M. Даніну павагі да вайсковых подзвігаў сваіх землякоў "энэрэмаўцы" выказалі з дапамогай любімай моладдзю "Партызанскай" песні. Зала адказала сваім кумірам удзячнасцю так, што ўвесь канцэрт вітала музыкаў стоячы.

Лявон Вольскі і яго сябры доўга не мудрылі і прапанавалі слухачам музычны канвейер з лепшых кампазіцый з мінулых альбомаў гурта. Гэтыя хіты —"Кумба-кукумба", "Паветраны шар", "Ментальнасць", "Катуй-ратуй", "Тры чарапахі" — якія, як заўсёды, выклікалі самыя гарачыя эмоцыі аматараў цяжкаметалічных рытмаў.

Сюрпрыз чакаў фэнаў N.R.M. пазней, калі музыкі зайгралі кампазіцыі са свайго новага альбома, выхад якога чакаецца ў хуткім часе. І сапраўды, у прэсе ўжо неадночы выказваліся здагадкі наконт таго, якое ж будзе гэтае новае тварэнне лепшага беларускага гурта, як па стылістыцы, так і па змесце і канцэпцыі. Ёсць надзейная прыкмета: калі музыкі пачалі "адпрацоўваць" новы матэрыял на публіцы, то гэта значыць, што чакаць прэм'еры засталося не вельмі доўга. Гледзячы на рэакцыю залы, новыя песні слухачам падабаюцца, бо вытрыманыя ў старых "энэрэмаўскіх" традыцыях: меладычныя, рытмічныя, багата і з фантазіяй аранжыраваныя...Навінкі — быццам працяг любімага і супер-прафесійнага па гуку альбома "Тры чарапахі". Песні "На беларускіх дарогах", "Фабрыка", "Тры чарапахі-2" ды іншыя ў хуткім часе зоймуць сваё месца сярод збору супер-хітоў беларускай рок-музыкі.

Не апошняе месца на новым альбоме, відавочна, зоймуць модныя зараз каверы. А гэта аўтарскія апрацоўкі кампазіцый з рэпертуару сусветнавядомых рок-гуртоў (да прыкладу "Nirvana", "Depeshe Mode") ды проста прыгожых і хвалюючых песень, як напрыклад, кампазіцыі гурта "Ulis" "Радыё Свабода", песняроўскай "Добры вечар, дзяўчыначка", "Халі-галі" з рэпертуару роднаснага N.R.M. гурта "Мроя"...

Карацей, выступ у канцэртнай зале "Мінск" даў падставу для разважанняў, прагнозаў ды перспектыўных накідаў адносна далейшага развіцця гурта. Не сакрэт, што для многіх сімпатыкаў N.R.M. становіцца трывожным той факт, што ўдзельнікі каманды ўсё больш і больш увагі аддаюць рэалізацыі сваіх сольных праектаў ("Крамбамбуля" Лявона Вольскага ці "Гарадзкія" Піта Паўлава). Ці не будзе гэта мець негатыўныя наступствы для рэалізацыі галоўнага праекта беларускага вызвольнага рок-руху? Перад фэнамі N.R.M. паўстае дылема: адна справа імкнуцца папоўніць сваю фанаграфічную калекцыю цікавымі дыскамі, падтрымаць сольныя эксперыменты любімых артыстаў і зусім іншая — сваімі рукамі спрыяць распаду цэлай мастацкай з'явы, імя якой N.R.M. Дык вось слухачы пакуль выбралі самы аптымістычны варыянт — ад душы віталі старыя і новыя кампазіцыі гурта і набывалі дыскі з сольнымі кампазіцыямі Лявона Вольскага ды Піта Паўлава. Ну, а музыкі, са свайго боку, вельмі пераканаўча давялі тое, што гурт як ніколі гатовы даць адказ на любыя выклікі лёсу, вырашыць любыя творчыя праблемы, што паўстаюць перад гуртом...

"Victory Day in КЗ "Мінск" сваю мэту выканаў: нагадаў моладзі пра гераічны подзвіг беларускага народа ў гады Другой сусветнай вайны. Хаця адбылося гэта як раз без таго пафасу, які звычайна суправаджае гэтае свята на плошчы Перамогі ці ў Палацы Рэспублікі. Відавочна, што сітуацыя не змянілася — святы ў кожнага жыхара Беларусі застаюцца свае, але крокі да паразумення трэба, усе ж, рабіць. Добра, што першымі іх на свой лад пачала ажыццяўляць моладзь. Няхай сабе і такім незвычайным чынам!

А. Мяльгуй, для "БМ"

Чадзяць усе!

Адчуўшы подых славы пасля даволі паспяховага скандальнага праекту "Hard life — Heavy musik", БМAgroup рушыць далей у тым жа напрамку. Чарговая кампіляцыя ад БМА гэтым разам прысвечана беларускаму хардкору.

Гледзячы на колькасць прадстаўленых на CD каманд, можна адразу падумаць: ці то хардкор — вельмі папулярны стыль сярод беларускіх рокераў, ці то прыналежнасць да вызначанага стылю — не такая ўжо абавязковая ўмова, каб трапіць на БМАшную зборку. Як зазначана ва ўкладцы да CD, слухачам прадстаўлены такія адгалінаванні жанру, як trashcore, grindcore, rapcore, а таксама extra-motor-punk, ska-pank, street-punk, нават industrial (?). Ужо становіцца цікава і хочацца хутчэй пачуць, што ж ёсць хардкор насамрэч, каб не лічыць сябе маральна састарэлай недасведчанай асобай. Паколькі на кампіляцыі ажно 23 кампазіцыі, распавядаць пра кожную — занятак доўгі, а вынік — нудны для чытача. Таму, як заўсёды, — галопам па ўсім кантынентам.

Першае, што зазначу: прысутнасць на альбоме мэтраў айчыннага хардкору (калі можна так казаць пра гэты адносна малады для Беларусі стыль) нароўні з камандамі, якія не маюць ніякага дачынення да хардкору, неяк злёгку нярвуе. Папярэдняя зборка выглядала стылістычна раўнейшай і, адпаведна, для вуха больш прыемнай. На гэтым CD мы з вамі можам пачуць, напрыклад, кавер на песню "Enter sandman" METALLICA (трэба разумець, класікаў хардкору?), ці "Калыханку" ад магілёўскага БЭДЛАМА (гэта такая дрэнная лама), якая хутчэй нагадвае творчасць Прафесара Лебядзінскага ці Тома Энжэлрыпера, чым хардкор. Апроч таго назіраецца цудоўнае ператварэнне ў беларускамоўных хардкоршчыкаў музыкаў, якія раней ні ў чым такім (і што да мовы, і што да стылю) заўважаны не былі. Відаць, ужо вельмі моцна захацелі патрапіць на БАСовішча.

J-МОРС з "Прапановай", якія гралі раней нешта "машиновременіподобное", намагліся таксама зрабіць хардкор — атрымалася вельмі нудная і дзіка раздражняльная рэч. Таксама вельмі дзіўна было пачуць GALINA ВЭZU з кампазіцыяй "Купала". Пэўна, хлопцы падумалі, што хардкор — гэта калі вельмі гучна раўсці прыпеў.

IQ-48 — стопудовыя рэперы з кампазіцыяй "Мой клён". Хто параіў хлопцам даць назву песні на тарашкевіцы? Толькі пасля неаднаразовага праслухоўвання разумееш, што размова ідзе пра клянаванне чалавека, а не пра дрэва. А можа, яны прыкалоліся так... (ці над імі прыкалоліся).

Берасцейскі KNUCKLEDUSTER (зразумела, чаму пра гэты гурт журналісты не пішуць: паспрабуйце самі набраць назву гурта хаця б некалькі разоў) з банальнай фішкай паганіць народныя песні. На гэты раз ахвярай стаў украінскі хіт усіх часоў "Падманула, падвяла".

Зараз пра больш прыемнае.

Цікава было пачуць Піта Паўлава ў незвычайным стане — агрэсіўнага хардкоршчыка. Даволі нечаканы атрымаўся вынік з замешаных METHOD OF MAYHEM, ZEMФІРЫ ды ПАПЁНКИНZ BAND — зусім не падобны на творчасць праекту HARACKIJA (як чамусьці зазначана насупраць імя PETE PAFF ва ўкладцы). Ды й рэп чытаць у Піта атрымліваецца нечакана добра, значна лепш, чым спяваць.

ZET з "Раз, два, тры" — ну, ZET, гэта ёсць ZET. Адзін з лепшых беларускіх гуртоў такога накірунку, а як жа яно можа быць інакш: музыкі, якія граюць!

SPLENETIC, якія апошнім часам пастаянна эксперыментуе з вакалістамі, гэтым разам прадстаўлены з экс-вакалістам СОНЦА МАО Шаманам. "Менталітэт" — не самая лепшая песня ад каманды такога ўзроўню. Кампазіцыя хутчэй падобная на творчасць СОНЦА МАО, таму, пэўна, гучыць у выкананні "спленэтыкаў" неяк недастаткова дынамічна і моцна. Але ж на гэтай кампіляцыі выгодна цешыць вуха на фоне незразумелых опусаў ад SHITFUN, PARTYZONE, ДЗЕЯНІЙ ды інш.

За SPLENETICам следам крочаць яшчэ адныя прадстаўнікі авангарду беларускага хардкору — КУКЛЫ з кампазіцыяй "Хлопчык". Вось тут ужо стопудовае пападанне ў стыль! Адзінае, што можна адзначыць — КУКЛЫ, пэўна, з тых гуртоў, якія па гучанню ў live-варыянце значна адрозніваюцца (у лепшы бок) ад варыянту на CD. Напрыклад, з СОНЦА МАО, як мне здаецца, адваротная сітуацыя: прадстаўленая на кампіляцыі песня "Ты сам", запісаная падчас выступу ў варшаўскай "Proxime", гучыць неяк сумбурна.

Беластоцкія ZERO-85 "Страчана Ітака" —і па якасці запісу, і па ўзроўню ігры няма да чаго прычапіцца. Папросту добрая музыка. Моцна, класна, дынамічна.

Аляксандр Памідораў — дастойны прадстаўнік кампаніі музыкаў (нароўні з ZERO-85, ZET, SPLENETIC, КУКЛЫ, zygimont VAZA), якія ня ўмеюць граць блага і нецікава. "Новы марш" — рэч, на першы погляд, абсалютна панкушная, у духе SEX PISTOLS ці DEAD KENNEDYS. Але ж дасведчаныя людзі паведамілі, што гэта і ёсць самы сапраўдны хардкор у класічным яго выглядзе.

І яшчэ адныя прадстаўнікі беларускай хардкор плыні, каманд малады, але дастаткова раскручаных, — ICE BRAINS з каверам SEPULTURAўскай "The roots bloody roots". Гэтым разам атрымаўся сапраўды кавер, а не папросту перакладзеная на беларускую мову ды перапетая адзін у адзін кампазіцыя вядомага гурта. У "Каранях свабоды" іншым разам сепультураўскі арыгінал нават і не ўзгадваецца.

Вось вам агульная замалёўка пра чарговы праект ад БМAgroup. Калі інфармацыі недастаткова — купляйце кампакт ды слухайце самі.

Алька, для "БМ"

19-20 ліпеня на звычайным месцы — у лесе пад Гродкам (што ля Беластока, калі хто не ведае) пройдзе чарговы фэст БАСовішча. Сярод удзельнікаў усе знаёмыя твары: N.R.M., КРАМА, ПАЛАЦ, а таксама пераможцы папярэдніх фэстаў. Як і ў мінулым годзе, напярэдадні БАСовішча ў Мінску пройдзе адборачны тур, прыняць удзел у якім маюць магчымасць усе жадаючыя каманды. Адзіная ўмова — да конкурсу дапускаюцца толькі беларускамоўныя кампазіцыі. Заявіць аб сваім удзеле можна, патэлефанаваўшы па тэл. 8-0296-49-08-88, праз пэйджар 211 85 85 аб. БМА, ці даслаўшы ліст на адрас: Мінск, 220085, а/с 5.



Тайны зеркального мира

В далекие времена на Крите и в Древней Греции, где зеркала изготовлялись из полированного камня и ярко начищенных медных пластин, подобные произведения искусства стоили дороже породистых лошадей, серебра и драгоценностей. Тогда и зародились первые поверья и обычаи, связанные с зеркалами. Например, чтобы узнать, каков будет исход болезни, античные врачи неглубоко погружали зеркало в воду. По тому, искажались ли в зеркале черты лица больного или оставались ясными, судили, умрет пациент или поправится.

На Руси долгое время зеркала были под запретом. Специальным указом 1666 года священникам строго-настрого запрещалось глядеться в зеркало — это считалось богопротивным делом. Да и любой уважающий себя человек ни за что не повесил бы дома зеркало.

Впрочем, запреты существуют для того, чтобы их нарушать. Потому гадания с использованием зеркал были распространены весьма широко, некоторые из них дошли и до наших дней.

Самое известное гадание с помощью двух зеркал, установленных друг напротив друга. Перед одним из них зажигались две свечи, так чтобы в зеркале отразился коридор. Особа, севшая гадать, должна пристально смотреть в конец зеркального коридора. Через какое-то время из глубины его выплывет образ будущего. Перед подобным гаданием полагалось завесить иконы, снять с шеи крест и положить зачем-то его под пятку — то есть отречься, таким образом, от помощи и защиты святых сил. Говорят, это гадание было настолько страшным, что некоторые из гадавших сходили с ума, когда в зеркальном коридоре с глазу на глаз встречались с призраками.

Впрочем, все мало-мальски связанные с мистическими делами люди — маги, колдуны, экстрасенсы — дружно советуют не экспериментировать с зеркалами. Удар зеркальной энергии может запросто разрушить хрупкую человеческую психику.

Мистики и экстрасенсы считают, что мы видим в зеркале не просто наше отражение, мы видим нашего зеркального двойника — копию нашего "Я", обитающую в потустороннем мире. Воздействуя на него можно влиять на свой (да и на чужой тоже) внешний облик и даже моделировать те или иные события нашей жизни. Посему никогда не отзывайтесь плохо о своем отражении — тем самым вы задаете отрицательную программу, которая не замедлит отразиться (в прямом смысле слова) на вашем внешнем облике или самочувствии.

Мы совершенно не задумываемся над некоторыми приметами, связанными с зеркалами, просто автоматически следуем им. Между тем большинство из них имеют весьма четкое логическое объяснение. Уходя из дома попросите вашего зеркального двойника оберегать жилище в ваше отсутствие — тем самым вы запираете двери потустороннего мира на замок. Если же по какой-то причине, например, забыв что-то дома, вы вернулись — загляните в зеркало еще раз: нарушенная вашим внезапным возвращением защита восстановится.

Считается, что зеркало не только охраняет ваш дом от нежеланных, невидимых гостей, оно еще и аккумулирует силу вашего дома. И этим также можно воспользоваться. Перед уходом на какое-либо важное мероприятие пожелайте себе удачи — и ваш двойник "выдаст" вам порцию энергии, необходимую для успешного завершения дел.



Иван Грозный, смертельно боявшийся сглазов, наговоров и проклятий, никому не позволял смотреться в зеркала своей жены Марии Нагой. Более того, он требовал, чтобы мастера, делавшие зеркала для нее, были слепыми.

В зеркале отражаются не только хозяева дома, но и люди чужие. И званые и незваные, не всегда доброжелательно к хозяевам настроенные. Сами того не подозревая, гости могут "зарядить" негативной энергией ваше зеркало, сказав что-нибудь вроде: "Что-то, милочка, ты сегодня неважно выглядишь". Еще больший вред могут нанести какие-либо гневные слова, брошенные перед уходом, и даже не высказанные вслух злые мысли ваших гостей. Весь этот негатив "накапливается" в зеркале и напрямую отражается на вас. Впрочем, есть простые правила, как нейтрализовать отрицательную энергию: время от времени все зеркала в доме следует протирать проточной водой. Для лучшего эффекта — водой, освященной в церкви. Кроме того, "очистить" зеркало можно свечой. Опять же, знающие люди утверждают, что свечку лучше брать церковную. Возьмите свечу, зажгите ее и обнесите зеркало сначала по краю, затем, как кисточкой, водите от края до края зеркала, постепенно опускаясь вниз. Если свеча начнет трещать — значит, зеркало накопило много всякой энергетической гадости. Повторяйте процедуру до тех пор, пока треск не прекратится.

Весьма осторожным следует быть при покупке зеркала уже бывшего в употреблении, особенно если вам не известно, что за люди являлись его хозяевами. Старые зеркала абсолютно непредсказуемы — в своей глубине они могут прятать и призраков, и картины давно минувших дней. Хорошо, если картины эти приятные и радостные — никакого вреда такое зеркало в дом не принесет, скорее, наоборот. Но самое страшное — принести в дом зеркало с заключенной в нем душой умершего человека. Простой прием распознать зеркало-душегуба: зажгите свечу — если пламя горит ровно, значит все нормально. Если же оно гаснет каждый раз, как только вы подносите свечу к зеркалу — что-то не так. В таком случае постарайтесь поскорее избавиться от подобного зеркала-душегуба. Лучше всего зеркало разбить и выпустить заключенную в нем душу на волю.

Обычай закрывать зеркала тканью, если в доме кто-то умер, известен всем. Зеркала принадлежат сразу двум мирам, являются чем-то вроде дверей в потусторонний мир зазеркалья. Считается, что душа, покинувшая тело, может заплутать и навсегда остаться в зеркальном лабиринте. И тут уж никто не может предсказать, чем чревато для вас и вашей семьи (да и для последующих поколений, которым по наследству перейдет это зеркало) подобное пленение.

Не менее опасными могут быть зеркала, запечатлевшие сцены убийств и насилия. Особенно опасно они воздействуют на психику детей, программируя их на жестокость, становясь причиной кошмаров и навязчивых страхов. Поэтому, говорят, стоит трижды подумать, прежде чем покупать старинное зеркало.

Еще одна примета, связанная с зеркалами — разбитое зеркало обязательно принесет в дом несчастье. А все потому, что, разбиваясь, зеркало высвобождает всю накопившуюся в нем энергию. В том числе и отрицательную. По этой же причине не следует опасаться треснувших зеркал.

Думаю, теперь понятно, что с зеркалами следует обращаться весьма осторожно? Впрочем, в наше время в отличие от древности зеркало стало совершенно обычным предметом домашнего интерьера. Даже самый суеверный человек сейчас вряд ли обойдется без зеркал. И все же принося зеркало в дом, необходимо учитывать несколько основных правил по его месторасположению.

В прихожей зеркало нужно повесить или поставить так, чтобы входя в дом, вы сразу же в нем отражались. Это поможет быстро очиститься от накопившегося за день негативного энергетического мусора. И лучше всего, чтобы это было зеркало, отражающее вас в полный рост. Еще одно важное замечание — зеркало не должно располагаться слишком низко, чтобы не "срезать" макушку самого высокого из домочадцев. Иначе энергетика этого человека ослабнет, он будет страдать головными болями.

Зеркало в ванной можно вешать, где вам заблагорассудится. Единственное правило — вы не должны нагибаться, чтобы увидеть свое лицо. Привыкнув регулярно видеть себя с опущенной головой, вы, фигурально выражаясь, будете жить, склонив голову. Кстати, зеркала в ванной можно не очищать указанными выше способами — текущая рядом вода смывает, уносит с собой все энергетические наслоения.

В спальне вообще лучше обойтись без зеркала. Ночь недаром считается временем нечистой силы, именно ночью в жилых помещениях скапливается большое количество негативной энергии. Зеркало, как уже говорилось, всегда не прочь подзарядиться какой-либо энергией (ему абсолютно все равно — положительная она или отрицательная) и передать ее человеку. Поэтому если уж вы никак не можете обойтись без зеркала в спальне, хотя бы постарайтесь, чтобы в нем не отражалась кровать, или завешивайте его на ночь. В противном случае вам не избежать кошмаров, бессонниц и плохого самочувствия по утрам. Это правило касается и зеркал в других комнатах — в них не должны отражаться любимые места вашего отдыха, например, кресло перед телевизором.

Впрочем, не воспринимайте все вышенаписанное слишком серьезно. Главное знать, что все реально настолько, насколько мы в это верим. И уж во всяком случае, не стоит винить во всех своих неудачах семейное зеркало. Поэтому, если вам какое-то время снятся кошмарные сны о том, как вы "заваливаете" экзамен, поищите природу этого кошмара в другом месте. В заброшенном в дальний угол учебнике, например...

Наталья Кожурова, "БМ"

"Беларуская маладзёжная"
Рэспубліканская грамадска-палітычная незалежная газета
Заснавальнік
Рэдакцыя газеты "Беларуская маладзёжная"
Рэдакцыйная калегія: А. Г. Пятроўская — загадчык аддзела інфармацыі, І.А. Слаўнікава — загадчык аддзела па сувязях з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі.

Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў, друкаваць артыкулы дзеля палемікі

Адрас рэдакцыі:
220134, Мінск,
вул. Якубоўскага, 15-1-77
Кантактныя тэлефоны: 57-00-43, 20-98-04
E-mail:belmol@irex.minsk.by
Пасведчанне аб рэгістрацыі № 665
Пры перадруку спасылка на "БМ" абавязковая

Падпісана ў друк 16 мая 2002 г. у 14.30
Надрукавана з дыяпазытываў заказчыка ў паліграфічным УП "Светоч", 220073, г. Мінск, вул. Камуністычная, 14.
Кошт свабодны
Тыраж 3000 экз. Заказ № 443

Галоўны рэдактар
Т.І. Мельнічук
(Нічыпарук)

Падпісны індэкс
63309